# u.trust Anchor/CryptoServer LAN

## Інструкцыі па тэхніцы бяспекі: Беларуская

Гэта інструкцыя па тэхніцы бяспекі распаўсюджваецца на прадукт CryptoServer CSPLight і ўсе прадукты, заснаваныя на прыладзе u.trust Anchor LAN/CryptoServer LAN V5 кампаніі Utimaco.




Малюнак 1. CryptoServer CSPLight




Малюнак 2. u.trust Anchor LAN/CryptoServer LAN V5

У дадзеным дакуменце ўсе гэтыя прадукты ў далейшым называюцца «u.trust Anchor/CryptoServer LAN».



*Калі ласка, выконвайце ўсе папярэджанні, інструкцыі па тэхніцы бяспекі і ўказанні, прыведзеныя на корпусе прылады або ў гэтай інструкцыі. У адваротным выпадку кампанія Utimaco не будзе несці ніякай адказнасці за любыя атрыманыя пашкоджанні.*
*Захоўвайце гэту інструкцыю ў бяспечным месцы і заўсёды ў межах дасяжнасці.*



*Няправільная ўстаноўка батарэй можа прывесці да выбуху. Утылізуйце выкарыстаныя батарэі ў адпаведнасці з інструкцыямі.*




*Абсталяванне павінна эксплуатавацца на вышыні не больш за 2000 м (6500 футаў) над узроўнем мора.*



*Выкарыстанне ў трапічных рэгіёнах забаронена.*

| | |
|---|---|
| *Тэмпература вонкавага асяроддзя* | ■ Падчас эксплуатацыі<br>▣ u.trust Anchor/CryptoServer LAN V5<br>☐ Карта u.trust Anchor PCIe: ад +10 °C да +50 °C (ад +50 °F да +122 °F)<br>☐ CryptoServer Se Series Gen2: ад +10 °C да +50 °C (ад +50 °F да +122 °F)<br>☐ CryptoServer CSe Series: ад +10 °C да +40 °C (ад +50 °F да +104 °F)<br>▣ CryptoServer CSPLight: ад +10 °C да +40 °C (ад +50 °F да +104 °F)<br>■ Падчас захоўвання: ад -10 °C да +55 °C (ад +14 °F да +131 °F) |

| | |
|---|---|
| *Вільготнасць* | Адносная вільготнасць павінна знаходзіцца ў межах ад 10% да 95%, без кандэнсацыі. |
| *Вышыня над узроўнем мора* | Не больш за 2000 м (6500 футаў). |
| *Узровень забруджвання* | Максімум 2 (згодна з IEC 60664-1). |
| *Клас бяспекі* | IP20 |

# 1 Транспарціроўка і захоўванне

- Перад транспарціроўкай прылады u.trust Anchor/CryptoServer LAN пераканайцеся, што сеткавыя злучальныя кабелі адключаны ад гнёздаў і ўсе злучальныя кабелі для іншых прылад былі выдалены.

# 2 Настольная ўстаноўка

- Пастаўце прыладу на бяспечную і ўстойлівую паверхню. Пазбягайце ўдараў і штуршкоў любога роду.
- Эксплуатацыя прылады Anchor/CryptoServer LAN паблізу вады ці іншых вадкасцей катэгарычна забаронена. Не пралівайце вадкасці на прыладу.
- Не кладзіце на прыладу прадметы, адзенне або паперу.
- Абараняйце прыладу u.trust Anchor/CryptoServer LAN ад уздзеяння вільготнасці, пылу, удараў, рэзкіх ваганняў тэмпературы і прамых сонечных прамянёў. Не размяшчайце прыладу паблізу ад ацяпляльных прыбораў, кандыцыянераў і г.д.
- Забяспечвайце належную вентыляцыю. Катэгарычна забараняецца памяшчаць прыладу ў шафу, не абсталяваную сістэмай вентыляцыі. Катэгарычна забараняецца закрываць вентыляцыйныя адтуліны прылады.
- Пазбягайце падключэння да электрычных ланцугоў, да якіх падключаны іншыя магутныя спажыўцы электраэнергіі (напрыклад, рухавікі, кандыцыянеры, капіравальныя апараты і г.д.) Існуе небяспека рэзкіх ваганняў напружання.
- Прылада не прызначана для ўстаноўкі ў непасрэдным полі зроку на камп'ютарнай рабочай станцыі. Каб пазбегнуць непажаданых блікаў на камп'ютарным працоўным месцы, прыладу нельга размяшчаць у непасрэдным полі зроку.

# 3 Падключэнне да камп'ютарнай сеткі і сеткі сілкавання

- Праверце напружанне сеткі сілкавання. Падключэнне прылады u.trust Anchor/CryptoServer LAN да сеткі сілкавання, напружанне якой не адпавядае патрабаванням, прывядзе да незваротнага пашкоджання прылады.
- Пераканайцеся, што электрычныя злучэнні з ланцугамі сілкавання не перагружаны.
- Падключаючы прыладу да электрычнай сеткі, пераканайцеся, што яна належным чынам заземлена. Калі некалькі прылад злучаны разам, токі іх разраду могуць сумарна дасягнуць недапушчальна высокага значэння.
- Карыстайцеся кабелямі сілкавання з засцярогай. Адключаючы кабелі, трымайцеся за вілку, а не за шнур. Гэта можа пашкодзіць кантакты і прывесці да няспраўнасцей.
- Абараняйце сілавыя кабелі ад механічнага ўздзеяння. Не стаўце мэблю або іншыя прадметы на кабелі сілкавання, абараняйце іх ад вострых або цяжкіх прадметаў.
- Не завязвайце кабелі сілкавання ў вузлы.

# 4 Адкрыццё корпуса прылады

- Адкрыццё корпуса прылады u.trust Anchor/CryptoServer LAN могуць адкрываць толькі супрацоўнікі кампаніі Utimaco або сертыфікаваныя гандлёвыя партнёры. Больш падрабязная інфармацыя прыведзена ў інструкцыі па эксплуатацыі. Каб

пазбегнуць паражэння электрычным токам або ўзгарання, катэгарычна забараняецца ўнясенне змен у якія-небудзь кампаненты ўнутры прылады.

- У выпадку, калі ўнутр корпуса прылады трапіць вада, правады ці іншыя іншародныя прадметы, неадкладна адключыце кабелі сілкавання і звярніцеся да дылера кампаніі Utimaco IS GmbH. Пры выкарыстанні прылады ў такім стане існуе небяспека ўзгарання або паразы электрычным токам.
- Не ўстаўляйце ніякія прадметы праз адтуліны ў корпусе прылады u.trust Anchor/CryptoServer LAN бо яны могуць выклікаць кароткае замыканне або дакрануцца да кампанентаў, якія знаходзяцца пад небяспечным напружаннем. Гэта можа прывесці да ўзнікнення пажару або небяспечнага да жыцця ўдару электрычным токам.

# 5 Чыстка

- Чыстка прылады u.trust Anchor/CryptoServer LAN павінна выконвацца мяккай тканінай, змочанай у слабым мыльным растворы. Затым высушыце прыладу сухой тканінай.
- Калі на корпус прылады патрапіла вада ці іншая вадкасць, пратрыце яго мяккай сухой тканінай.
- Катэгарычна забараняецца выкарыстоўваць для ачысткі бензін, растваральнік, спірт або іншыя агрэсіўныя сродкі.

# 6 Устаноўка прылады u.trust Anchor/CryptoServer LAN у стойку памерам 19 цаляў

- Належныя вынікі эксплуатацыі прылады u.trust Anchor/CryptoServer LAN пры ўстаноўцы яе ў іншыя накіравальныя рэйкі ці іншыя прыстасаванні не гарантуюцца.
- Каб падняць прыладу u.trust Anchor/CryptoServer LAN і паставіць яе ў стойку, патрэбны два чалавекі. Тое ж самае тычыцца аперацыі вымання са стойкі.

# 7 Вяртанне

Вяртаючы прадукт «u.trust Anchor/CryptoServer LAN» у кампанію Utimaco IS GmbH, неабходна выконваць наступныя ўмовы:

*У склад прадукту ўваходзяць літыевыя батарэі, якія адпавядаюць нормам UN38.3. Катэгарычна забараняецца вяртанне літыевых батарэй, якія, пры пэўных умовах, могуць выклікаць небяспечнае вылучэнне цяпла, узгаранне, або кароткае замыканне, або вяртанне пашкоджаных батарэй.*

- Маркіроўка аб наяўнасці літыевых батарэй




Малюнак 3. Маркіроўка аб наяўнасці літыевай батарэі.

  - Замяніце зорачку «*» на малюнку абрэвіятурай «UN38.3», а дзве зорачкі «**» – нумарам тэлефона спецыяліста з вопытам работы з прадуктам, а потым прымацуйце этыкетку да ўпакоўкі.

- Да кожнай упакоўкі прымацуйце этыкетку аб наяўнасці літыевых батарэй на бачным месцы.
- Калі ў пастаўку ўключаны ўпакоўкі з этыкеткамі аб наяўнасці літыевых батарэй, да кожнай авіянакладной павінна далучацца спецыяльная этыкетка з тэкстам «Батарэі з металічным літыем, адпаведна Раздзелу II Інструкцыі па ўпакоўванню PI 970». Гэта інфармацыя павінна быць унесена ў графу авіянакладной «Тып і колькасць тавараў».

- Упакоўка адпраўленняў
  - Для транспарціроўкі выкарыстоўвайце арыгінальную ўпакоўку.
  - Прадукт павінен быць запакаваны, замацаваны або забяспечаны мяккай падкладкай, каб пры звычайных умовах транспарціроўкі ён не змяняў сваё палажэнне і быў абаронены ад пашкоджання ці прабіцця, а змесціва не магло патрапіць у знешнюю ўпакоўку. Памеры знешняй упакоўкі павінны адпавядаць памерам унутранай упакоўкі або асобных упаковак. Калі яны меншыя за знешнюю ўпакоўку, трэба запоўніць зазоры такім чынам, каб унутраная ўпакоўка не мяняла сваё палажэнне падчас транспарціроўкі.

## Выхадныя звесткі


| | |
|---|---|
| Аўтарскае права 2021 | Utimaco IS GmbH<br>Germanusstr. 4<br>D-52080 Aachen, Germany (Аахен, Германія) |
| Тэлефон | Паўднёвая і Паўночная Амерыка +1-844-UTIMACO (+1 844-884-6226)<br>Еўропа, Блізкі Усход і Афрыка +49 800-627-3081<br>Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён +81 800-919-1301 |
| Вэб-сайт | https://support.hsm.utimaco.com |
| Адрас электроннай пошты | support@utimaco.com |
| Версія дакумента | 1.0.4 |
| Дата | 2021-06-24 |
| Стан | Канчатковы |
| Дакумент №: | 2020-0024-be-by |



| | |
|---|---|
| Усе правы абаронены | Ніякая частка гэтай дакументацыі не можа быць перадрукавана ў любой форме (паліграфічным, фотакапіравальным або любы іншы чынам) або апрацавана, прадублявана або распаўсюджана з дапамогай электронных сістэм без пісьмовага дазволу Utimaco IS GmbH.<br>Utimaco IS GmbH пакідае за сабой права палепшаць або змяняць гэтую дакументацыю без папярэдняга паведамлення. Utimaco IS GmbH не нясе ніякай адказнасці за памылкі друку і іншую недакладную інфармацыю.<br>Усе назвы брэндаў, гандлёвыя маркі і зарэгістраваныя таварныя знакі з'яўляюцца ўласнасцю іх законных уладальнікаў. |